УДК 821.161.3.091(09)

# Рэпрэзентацыя дзеячаў беларускай культуры ў прозе Максіма Гарэцкага

**Налётава Н.М.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*Дзеячы культуры, якія плённа працавалі на ніве нацыянальнага адраджэння, прыцягваюць увагу айчынных пісьменнікаў.*

*Мэта дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці навуковай і мастацкай інтэрпрэтацыі вядомых беларускіх дзеячаў-адраджэнцаў у “Гісторыі беларускае літаратуры” М.І. Гарэцкага і яго літаратурных творах: апавяданні “Фантазія”, аповесцях “Меланхолія”, “На імперыялістычнай вайне”.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам для даследавання абраны навуковыя працы “Беларусы” Я.Х. Карскага, “Гісторыя беларускае літаратуры” і мастацкая проза М.І. Гарэцкага. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі прыёмы канкрэтна-гістарычнага, параўнальнага і дэскрыптыўнага метадаў.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Праведзены параўнальны аналіз ацэнкі вядомых дзеячаў у мастацкай прозе і ў даследаванні “Гісторыя беларускае літаратуры” М.І. Гарэцкага.*

***Заключэнне.*** *У празаічных творах М. Гарэцкі вылучаў у якасці дамінантнай лініі эстэтычнага асэнсавання дзеяча культуры яго ўдзел у нацыястваральнай працы, а ў “Гісторыі беларускае літаратуры” ён усебакова характарызаваў іх творчую дзейнасць на ніве беларускага пісьменства.*

***Ключавыя словы:*** *навуковая і мастацкая рэпрэзентацыя, дзеяч культуры, адраджэнне, нацыянальная самасвядомасць.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 26. – С. 199–203)*

# Representation of People of Belarusian Culture in the Prose of Maxim Garetski

**Naliotava N.M.**
***Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk***

*People of culture, who contributed with their creativity to the national revival, attract attention of the domestic writers.*

*The purpose of the research is to identify features of scientific and art interpretation of outstanding Belarusian revival actors in “History of Belarusian Literature” by M.I. Garetski and his literary works: narrations “Fantasy”, Melancholy”, “At Imperialist War”.*

***Material and methgods.*** *The research material was scientific works “Belarusians” by Ya.Kh. Karski, “History of Belarusian Literature” and art prose by M.I. Garetski. Basic research methods were definite historic, comparative and descriptive ones.*

***Findings and their discussion.*** *A comparative analysis of the assessment of outstanding workers in art prose and in the study “History of Belarusian Literature” by M.I. Garetski is made.*

***Conclusion.*** *In his prosaic works M.I. Garetski identified as a dominant line of aesthetic understanding by a worker of art his participation in nation building work. In “History of Belarusian Literature” he characterized their creative input in Belarusian writing.*

***Key words:*** *scientific and art representation, a worker of culture, revival, national self identification.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 26. – P. 199–203)*

На працягу XIX–XX стагоддзяў у літаратурным працэсе Беларусі пад непасрэдным уплывам грамадска-палітычных падзей перыядычна адбываліся значныя культурна-эстэтычныя зрухі. Істотна ўзрасла цікавасць да айчыннага мінулага і гістарычных дзеячаў, якія плённа працавалі на ніве нацыянальнага адраджэння. Героямі празаічных твораў XX–XXI стагоддзяў нярэдка былі абраны значныя і славутыя постаці беларускай гісторыі (асветнікі, пісьменнікі, мастакі, грамадскія дзеячы і інш.), сярод якіх наступныя: Еўфрасіння

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* nalyotova.nathalie@mail.ru – **Н.М. Налётава**

Полацкая (“Прыдыслава” В. Іпатавай, “Святыя грэшнікі” А. Асіпенкі, “Спакуса” Т. Бондар, “Пакліканыя” В. Коўтун), Францыск Скарына (“Францішак Скарына” З. Бядулі, раздзел “Беларускія гуманісты” з “Зямлі пад белымі крыламі” У. Караткевіча, “Францішак Скарына” С. Хурсіка, “Георгій Скарына” М. Садковіча і Я. Львова, “Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае” А. Лойкі), Мікола Гусоўскі (“Час чумы” У. Арлова), Пётр Мсціславец (“Мсціслаўцаў посах …” Э. Ялугіна), Кастусь Каліноўскі (“Каласы пад сярпом тваім” У. Караткевіча, “Восень пасярод вясны” А. Мальдзіса, “Літоўскі воўк” А. Наварыча), Францішак Багушэвіч (“Пры апазнанні – затрымаць” В. Хомчанкі), Алаіза Пашкевіч (“Крыж міласэрнасці” В. Коўтун, “Стану песняй…”, “На струнах буры” і “На полымі любві” Л. Арабей), Максім Багдановіч (“Развітанне” Б. Мікуліча, “Загадка Багдановіча” М. Стральцова), Цішка Гартны (“Пасля нябыту” і “Без эпітафіі” Э. Ялугіна), Янка Купала (“Ой, рана на Івана” З. Бандарынай, “Незабыўныя дарогі” і “Дарогі песняра” В. Віткі, “Як агонь, як вада …” А. Лойкі), Якуб Колас (“Колас расказвае пра сябе” М. Лужаніна), Уладзімір Караткевіч (“Наш Караткевіч”, “Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі” А. Лойкі), Гаўрыіл Вашчанка (“Чырвоная брама” В. Карамазава), Антон Бархаткоў (“Антон” В. Карамазава), Станіслаў Жукоўскі (“Мой брат духоўны …” В. Карамазава) і іншыя, якія з’яўляюцца сімвалам нашай нацыі.

Розныя падыходы пісьменнікаў у асвятленні гэтых вобразаў (суадносіны факта і мастацкага вымыслу, аб’ектыўнага і суб’ектыўнага пачаткаў, кананічных характарыстык і індывідуальнага пісьменніцкага бачання) прыцягваюць увагу многіх сучасных айчынных літаратуразнаўцаў, такіх як В.К. Шынкарэнка, І.М. Запрудскі, В.Ю. Бароўка, Л.Г. Кісялёва, В.І. Локун, Т.А. Фіцнер, І.І. Дамарад, А.М. Дарагакупец, Г.М. Друк, С.М. Тарасава, Н.М. Кунгер, Ю.В. Кішкурна, Н.В. Гальго і інш.

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена адсутнасцю ў беларускім літаратуразнаўстве сістэмнага навуковага асэнсавання вобразаў пісьменнікаў, створаных іншымі пісьменнікамі, а таксама параўнальнай рэпрэзентацыі дзеячаў культуры ў мастацкай і навуковай літаратуры.

Мэта дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці навуковай і мастацкай інтэрпрэтацыі вядомых беларускіх дзеячаў-адраджэнцаў у “Гісторыі беларускае літаратуры” М. Гарэцкага і яго літаратурных творах: апавяданні “Фантазія”, аповесцях “Меланхолія”, “На імперыялістычнай вайне”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для нашага даследавання абраны навуковыя працы “Беларусы” Я.Х. Карскага, “Гісторыя беларускае літаратуры” М.І. Гарэцкага і мастацкая проза (апавяданне “Фантазія” і аповесці “Меланхолія”, “На імперыялістычнай вайне”) М.І. Гарэцкага. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі прыёмы канкрэтна-гістарычнага, параўнальнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Тэндэнцыя мастацкага адлюстравання знакавых постацей нацыянальнай гісторыі і культуры ў айчыннай літаратуры закладвалася арыгінальным, надзвычай эрудзіраваным празаікам, драматургам, даследчыкам літаратуры, публіцыстам, педагогам, лексікографам, перакладчыкам, фалькларыстам Максімам Іванавічам Гарэцкім (1893–1938), творчая спадчына якога па пэўных грамадска-палітычных прычынах працяглы адрэзак часу была ізалявана ад чытача. Вядомы даследчык беларускай літаратуры М.І. Мушынскі слушна называў М. Гарэцкага “гонарам і сумленнем беларускай нацыі, яе духоўным настаўнікам, які ўнёс велізарны ўклад у фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў” [1, с. 381].

Тэматычная скіраванасць прозы М. Гарэцкага 1920–1930 гадоў не да адлюстравання паслякастрычніцкай савецкай рэчаіснасці, а да нядаўняга мінулага была, па сцвярджэнні М.І. Мушынскага, “формай апасродкаванай ацэнкі палітычнай сістэмы, да якой пісьменнік … ставіўся даволі крытычна” [1, с. 404], нежаданнем ствараць мастацкія палотны згодна з ідэалагічнымі патрабаваннямі новага часу. Азначаны перыяд вылучаецца паслядоўнасцю пісьменніка ў выяўленні яго ўласных творчых і грамадска-палітычных поглядаў, у абароне нацыянальна-адраджэнскай праграмы.

У апавяданні “Фантазія” (1921) згадваюцца знакамітыя гістарычныя асобы, якія клапаціліся аб становішчы “Бацькаўшчыны мілай” [2, с. 117], аб развіцці культуры, чалавечай годнасці і нацыянальнай самасвядомасці суайчыннікаў. Гэта вядомыя асветнікі, гуманісты і пісьменнікі Францыск Скарына, Янка Купала, Францішак Багушэвіч, Алаіза Пашкевіч, Максім Багдановіч, Іван Луцкевіч, Лявон Гмырак, Алесь Гарун, Сяргей Палуян, Карусь Каганец, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Жанравыя межы апавядання не дазволілі М. Гарэцкаму даць разгорнутую, падрабязную характарыстыку гэтых асоб, але ў творы выкарыстоўваюцца лаканічныя заўвагі тыпу “сумны” [2, с. 117], “панураны” [2, с. 117], “з расцерзаным да краю сэрцам вялікага гуманіста” [2, с. 117], “засмучона нахіліўся” [2, с. 118], “ад чорных дум паніклы” [2, с. 118], “прамовіў горка” [2, с. 118] (Ф. Скарына); “сумна паглядзеў” [2, с. 117], “баліць душа” [2, с. 117] (Я. Купала); “руплівая сяброўка” [2, с. 118] (Цётка), “народны баян” [2, с. 118], “бацька адраджэння” [2, с. 118] (Ф. Багушэвіч), “разважны каранасты” [2, с. 119] (К. Каганец), “калматабровы” [2,

с. 119] (М. Багдановіч), якія падкрэсліваюць рысы знешняга аблічча, псіхалагічны стан ці адчуванні герояў, аўтарскае стаўленне да іх.

Акрамя таго, з традыцыйных літаратурных прыёмаў для раскрыцця характару героя пісьменнік актыўна выкарыстоўвае дыялогі. Так, у “Фантазіі” гуманістычныя погляды самога М. Гарэцкага адносна права беларускага народа на самавызначэнне яскрава выяўляюцца ў дыялогу паміж Ф. Скарынам і Я. Купалам: “Магутны кліч твой раздаецца ўжо даўно – і скрозь, ад краю ў край, па Беларусі … А шмат з’явілася? Народ за доўгія вякі няволі аглох і зрабіўся нячулым” [2, с. 118]. Выбар самім пісьменнікам для мастацкага адлюстравання менавіта гэтых гістарычных асоб матываваны іх руплівай і плённай, самаадданай дзейнасцю на ніве нацыянальнай культуры. Да таго ж Максім Гарэцкі ў распрацоўцы нацыянальна-культурнай і мастацка-эстэтычнай праграмы “нашаніўства” быў блізкі па поглядах да многіх літаратараў пачатку XX стагоддзя.

Падрабязна ж значэнне дзейнасці гэтых культурных дзеячаў у гісторыі беларускай літаратуры вызначаецца М. Гарэцкім ў навуковым даследаванні “Гісторыя беларускае літаратуры” (1920), якое было заклікана пацвердзіць маштабы творчай дзейнасці народа і яго інтэлігенцыі. Напрыклад, *Францыск Скарына*, па заўвазе М. Гарэцкага-літаратуразнаўцы, “у духу гуманістычных поглядаў … вучыць людзей любіць свой родны край, прычым патрыятызм яго з’яўляецца як бы дакорам фальшываму патрыятызму тагачасных магнатаў, любіўшых сваё гаспадарства толькі для сваіх асабістых карысцей” [3, с. 120], і “дбаць аб развіцці свае народнае культуры” [3, с. 120]. Выказаныя ў першай палове XVI стагоддзя вядомым асветнікам думкі, паводле Гарэцкага, не страчваюць сваёй актульнасці і сёння.

Пры аналізе ж творчасці *Янкі Купалы* М. Гарэцкі зазначае: “Найчасцей строіць паэт сваю ліру на адраджэнскі лад, паказваючы думку беларускімі малюнкамі сацыяльнага характару. Грамадзянскія матывы – на першым плане … Ідэалогія адраджэння ёсць галоўнай прыметай … усяе паэзіі песняра” [3, с. 319].

У “Гісторыі беларускае літаратуры” *Алаіза Пашкевіч* падаецца літаратурным крытыкам з “фанатычнай і напружана-адраджэнскай” [3, с. 290] любоўю да Беларусі, яе папярэднік *Францішак Багушэвіч* – “духоўным бацькам нацыянальна-сацыяльнага адраджэння” [3, с. 260], “першым беларускім песняром-рэвалюцыянерам” [3, с. 260], “першым нацыянальным беларускім паэтам” [3, с. 260], “песняром класавым, вешчуном сацыяльнай рэвалюцыі” [3, с. 260], які “скіраваў нашу літаратуру на пэўны натуралістычны шлях і звязаў яе з народам” [3, с. 260], *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* – “чулым чалавекам свайго часу, які … найлепей адчуваў пульс жыцця і патрэбы народа, але, як пан, радзіўся і памёр з нічога не вартымі поглядамі на развязанне сацыяльных пытанняў у нашым краі” [3, с. 219], *Карусь Каганец* – “ідэйна-грамадскім працаўніком, вядомым не толькі беларускай інтэлігенцыі, але й шырокім колам краёвых працаўнікоў вызваленчага руху канца 90-х і 900-х гг.” [3, с. 284] і аўтарам знакамітага патрыятычнага лозунга: “Беларусь трэба падымаць!”, *Алесь Гарун* – пісьменнікам з “незвычайнай, бязмернай любоўю да бацькаўшчыны” [3, с. 339], творцам, які “гаруе, што народ яго не мае нацыянальнае волі, што яго гнятуць нацыянальныя ворагі, але разам з тым ён востра адчувае і сацыяльнае гнібенне сваёй нацыі” [3, с. 339–340], *Ян Луцкевіч* – “выдатнай культурнай сілай у адраджэнні і палітычным кіраўніком такога руху, дзе развіццё нацыянальнае літаратуры было грунтам усяе працы” [3, с. 283], хаця і “сам блізу што й не пісаў, зрабіў тым часам незвычайна многа ў гісторыі нашаніўскае літаратуры … гуртуючы ля сябе людзей слова і жывучы з імі адной ідэяй” [3, с. 283], *Максім Багдановіч* – “паэтам-філосафам” [3, с. 347] і “паэтам-стылістам” [3, с. 347], які істотна выдзяляецца “з аднароднай сям’і нашаніўскіх паэтаў і пісьменнікаў” [3, с. 347], бо “ані адраджэнне, ані сацыяльны элемент не складаюць галоўных адзнак яго творчасці” [3, с. 347], а таксама літаратурным крытыкам нашаніўскага перыяду разам з *Лявонам Гмыракам*.

На падставе параўнальнага аналізу характарыстыкі дзеячаў беларускай культуры ў мастацкім і навуковым дыскурсе М. Гарэцкага можна зрабіць выснову, што ў абодвух выпадках яны цалкам супадаюць.

У апавяданні “Фантазія” М. Гарэцкім выказваецца думка, што “Бацькаўшчыну мілую” [2, с. 117], “распятую” [2, с. 117] краіну (падзеі ў апавяданні адбываюцца ў перыяд грамадзянскай вайны. – *Н.Н.*) можа выратаваць беларуская інтэлігенцыя, на якую ўскладаецца цяжкая і надзвычай важная місія правадыра, абуджальніка нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця ўласнай годнасці, кансалідацыі народных сіл. У згаданым творы выкарыстоўваецца сімвалічны вобраз Купалавага вялікага сходу, на які ўсіх пераліčаных вышэй дзеячаў культуры склікае цень беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

Натуральна, што па прычыне ўзнятых у апавяданні “Фантазія” грамадска-палітычных праблем яно не магло быць надрукавана ў 1920-я гады і станоўча, без ідэалагічных ярлыкоў, ацэнена тагачаснай савецкай крытыкай, а было прадстаўлена шырокаму колу чытачоў толькі ў другой палове 1950-х гадоў, калі былі сфарміраваны спрыяльныя грамадска-

палітычныя ўмовы і адбылася пераацэнка створанага пісьменнікам.

Як сведчыць сам М. Гарэцкі, пры ўкладанні "Гісторыі беларускае літаратуры" ён абапіраўся на фундаментальную шматтомную працу "Беларусы" выдатнага філолага-славіста, заснавальніка беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнографа, палеографа, бібліёграфа, фалькларыста, акадэміка Расійскай Імператарскай акадэміі навук Яўхіма Хведаравіча Карскага (1860/1861–1931). Заслуга Я. Карскага перш за ўсё ў тым, што з уласцівай яму грунтоўнасцю, з неабвержнай навуковай аргументаванасцю вучоны паказаў шырокаму свету самабытнасць, выразную нацыянальную адметнасць беларускага народа, раскрыў яго традыцыйную культуру, у прыватнасці, літаратуру.

Напрыклад, у другім выпуску трэцяга тома – "Старажытная заходнеруская пісьменнасць" – даследчык разгледзеў перакладную і кнігавыдавецкую дзейнасць Францыска Скарыны. Ён назваў Скарыну "одним из замечательнейших западнорусских деятелей первой половины XVI столетия" [4, с. 24].

У трэцім выпуску трэцяга тома – "Мастацкая літаратура на роднай мове" – пададзены агляд новай беларускай літаратуры ад пачатку XIX стагоддзя па 1921 год уключна. У ім Я. Карскі падрабязна спыніўся на разглядзе беларускамоўнай творчасці *Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча,* рэвалюцыйнай публіцыстыкі 1860-х гадоў *Кастуся Каліноўскага*, а таксама ўсебакова ахарактарызаваў мастацкую спадчыну *Францішка Багушэвіча, Алаізы Пашкевіч, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага*.

Так, у адносінах да *Францішка Багушэвіча* Я. Карскі слушна заўважае: "Его поэзия нисколько не напоминает его предшественников, старавшихся в идиллической простоте белорусской жизни найти примирение с неприглядной действительностью; подыскать оправдание тому гнёту, который тяготел над народом сначала со стороны панов-рабовладельцев, а затем со стороны новых опекунов в лице местной администрации и полиции" [4, с. 412–413]. *Алаіза Пашкевіч* характарызуецца як прадаўжальніца традыцый *Францішка Багушэвіча*, як рэвалюцыйны дзеяч, *Іван Луцэвіч* называецца ў шэрагу "«будителей» заснувшей Белоруссии .., которые стараются открыть глаза населению на его природу, жизнь, общественное положение, на язык, на историю; хотят напомнить белорусу его славное прошлое и подчеркнуть тяжелое современное положение" [4, с. 441]. Паэтычныя творы *Максіма Багдановіча*, што закранаюць агульначалавечыя матывы, па сцвярджэнні Я. Карскага, "изящны по форме, очень разнообразны по своим размерам и по содержанию" [4, с. 523]. Літаратурная творчасць жа *Максіма Гарэцкага* ў выданні "Беларусы" падвяргаецца сур'ёзнай крытыцы і, на думку аўтара, знаходзіцца ў "зародкавым стане" [4, с. 570]. *Алеся Гаруна* аўтар "Беларусаў" асуджае за шырокае выкарыстанне ў творах паланізмаў, а *Змітрака Бядулю* – за абмежаванасць тэмы, бо іх творы "не выходят за пределы обыкновенно трактуемых новейшими белорусскими писателями" [4, с. 558].

На падставе параўнальнага аналізу ацэнкі дзеячаў беларускай культуры М. Гарэцкім і Я. Карскім мы прыйшлі да высновы, што яны не заўсёды супадаюць.

Заўважым, што адной з бясспрэчных заслуг М. Гарэцкага з'яўляецца ўвядзенне ў нацыянальную прозу новага героя – вясковага інтэлігента, які ўсведамляе ўласную адказнасць за лёс народа і будучыню краіны. Духоўнае аблічча і жыццёвая пазіцыя такога героя, у прыватнасці, Лявона Задумы, выразна выяўляюцца, напрыклад, у сацыяльна-псіхалагічнай аповесці "Меланхолія" (1916–1921, 1928). У творы, напоўненым глыбокім філасофскім зместам, закранаюцца такія значныя тэмы, як "інтэлігенцыя і народ", "шляхі вызвалення ад нацыянальнага прыгнёту", "сэнс жыцця і прызначэнне чалавека" і некаторыя іншыя.

Як і ў апавяданні "Фантазія", пісьменнік звяртаецца да мастацкага адлюстравання вобразаў вядомых дзеячаў Беларусі, якіх за іх неацэнны ўнёсак у развіццё нацыянальнай культуры па праве называе "вялікімі сынамі краіны" [2, с. 190]. Гэта першы беларускі і ўсходнеславянскі кнігадрукар Францыск Скарына, Кастусь Каліноўскі, Мацей Бурачок, Янка Купала і Якуб Колас. Пісьменнік пазбягае падрабязных апісанняў гэтых дзеячаў, узгадвае іх у кантэксце гаворкі пра Віленшчыну як гістарычны цэнтр развіцця беларускай культуры і зараджэння перадавых поглядаў, выкарыстоўвае толькі ў адносінах да іх трапныя азначэнні-перыфразы тыпу "вялікі сейбіт гуманізму і асветы" [2, с. 190] (Ф. Скарына), "адважны правадыр паўстанцаў" [2, с. 190] (К. Каліноўскі), "бацька нашага адраджэння" [2, с. 190] (Ф. Багушэвіч), якія падкрэсліваюць важны ўнёсак гэтых асоб у культурнае развіццё Айчыны і выяўляюць да іх аўтарскае стаўленне.

У "Гісторыі беларускае літаратуры" М. Гарэцкі падрабязна аналізуе дзейнасць беларускага рэвалюцыянера, стваральніка агітацыйнай літаратуры 1860-х гг. *Кастуся Каліноўскага*, называючы яго "самай выдатнай і магутнай у тым часе постаццю" [3, с. 229], творчасць *Якуба Коласа*-"рэвалюцыянера"[3, с. 297]. Вуснамі Лявона Задумы ў аповесці "Меланхолія" пісьменнік выказвае думку, што "ў нашым вызваленчым руху настаўнікі і літаратары яшчэ

доўга будуць больш патрэбны, чым каморнікі і аграномы" [2, с. 186], і высока ацэньвае адказную ролю дзеячаў беларускай культуры перад грамадствам.

Напісаная пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі аповесць "Меланхолія" маніфестуе "складаную светапоглядную эвалюцыю пісьменніка, які … меў магчымасць глыбока асэнсаваць негатыўныя вынікі рэвалюцыйных метадаў пабудовы справядлівага грамадства" [1, с. 406], расчараваўся ў дзейнасці савецкай улады ў адносінах да нацыянальных меншасцей, таму ўспрымаецца зараз як праекцыя на грамадскія падзеі пачатку XX стагоддзя.

У дакументальна-мастацкай аповесці "На імперыялістычнай вайне" (1914–1915, 1919–1920, 1925–1926, 1928), напісанай у форме запісак, Беларусь падаецца Лявонам Задумам "беднай, убогай, невучонай і такой багатай творчым духам мужыцкай бацькаўшчынай" [2, с. 388]. Таксама згадваюцца змешчаныя ў "Нашай ніве" за 25 верасня 1914 года творы вядомага беларускага пісьменніка *Змітрака Бядулі*, а менавіта апавяданне "Летапісцы" і верш "Волат". Падрабязная ж характарыстыка творчасці Змітрака Бядулі даецца пісьменнікам у "Гісторыі беларускае літаратуры". Напрыклад, на думку М. Гарэцкага, згаданы намі раней верш "Волат" з'яўляецца "прыгожым па форме" [3, с. 354].

**Заключэнне.** Падсумоўваючы сказанае, неабходна падкрэсліць, што ў прааналізаваных намі мастацкіх творах і навуковай "Гісторыі беларускае літаратуры" М. Гарэцкім была выказана ідэйная праграма далейшага духоўнага абуджэння беларусаў, прасякнутая патрыятычным пафасам, якую можна сфармуляваць наступнымі словамі самога пісьменніка: "Няма нацыянальнага адраджэння без сацыяльнага, а сацыяльны дабрабыт нічога не варты без волі нацыі" [3, с. 340].

У апавяданні "Фантазія" і аповесцях "Меланхолія", "На імперыялістычнай вайне", навуковым даследаванні "Гісторыя беларускае літаратуры" аўтар згадаў вядомых культурных дзеячаў Ф. Скарыну, Ф. Багушэвіча, А. Пашкевіч, З. Бядулю, М. Багдановіча, І. Луцкевіча, Л. Гмырака, А. Гаруна, С. Палуяна, К. Каганца, Я. Купалу, Я. Коласа, якія ўнеслі значны ўклад у самасцвярджэнне беларусаў як народа. Параўнальны аналіз ацэнкі гэтых дзеячаў у мастацкай прозе і ў даследаванні "Гісторыя беларускае літаратуры" паказаў, што ў празаічных творах М. Гарэцкі вылучаў у якасці дамінантнай лініі эстэтычнага асэнсавання дзеяча культуры яго ўдзел у нацыястваральнай працы, а ў "Гісторыі беларускае літаратуры" ён усебакова характарызаваў іх творчую дзейнасць на ніве беларускага пісьменства. Мастацкая рэпрэзентацыя дзеячаў айчыннай культуры ў прозе М. Гарэцкага была накіравана на акцэнтаванне ідэі, што выдатныя дзеячы культуры – сведчанне высокага духоўнага, інтэлектуальнага патэнцыялу народа.

## Літаратура


1. Мушынскі, М.І. Максім Гарэцкі / М.І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск, 1999. – Т. 1. – С. 381–426.
2. Гарэцкі, М.І. Творы: апавяданні, аповесці / М.І. Гарэцкі; уклад. Т.С. Голуб; прадм. М.П. Кенькі. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 446 с.
3. Гарэцкі, М.І. Гісторыя беларускае літаратуры / М.І. Гарэцкі; уклад. і падрыхт. тэксту Т.С. Голуб. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 479 с.
4. Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский; коммент. Т.И. Вабищевич, В.М. Казберука, О.П. Кричко. – Минск: БелЭн, 2007. – Т. 3, кн. 3: Очерки словесности белорусского племени. – 704 с.


*Паступіў у рэдакцыю 15.01.2018 г.*